Распараджэнне Старшыні Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

Святы Айцец Францішак устанавіў *Сусветны дзень малітвы аб ахове стварэння*, які будзе святкавацца штогод 1 верасня. Устанаўленне гэтага дня з'яўляецца вынікам выдання прысвечанай праблемам экалогіі і аховы навакольнага асяроддзя энцыклікі "Laudato sì", абнародаванай 24 мая 2015 г.

Устанаўліваючы *Сусветны дзень малітвы аб ахове стварэння,* Папа падкрэсліў яго экуменічны характар. Усе хрысціяне павінны ўносіць свой уклад у вырашэнне экалагічнага крызісу. Для гэтага неабходна з багатай хрысціянскай спадчыны чэрпаць матывацыю, памятаючы аб тым, што духоўнасць не аддзелена ад прыроды і рэчаіснасці гэтага свету. Таму экалагічны крызіс заклікае нас да экалагічнага навяртання.

*Сусветны дзень малітвы аб ахове стварэння* павінен стаць нагодай да аднаўлення нашага паклікання быць вартаўнікамі стварэння і да супольнага разам з іншымі хрысціянскімі супольнасцямі адказу на такі небяспечны выклік нашага часу, якім з'яўляецца экалагічны крызіс.

У сувязі з устанаўленнем *Сусветнага дня малітвы аб ахове стварэння*, у паразуменні з усімі ардынарыямі беларускіх дыяцэзій, маючы таксама на ўвазе няпростую экалагічную сітуацыю ў Беларусі, загадваю 1 верасня 2015 г. пасля кожнай святой Імшы памаліцца наступнай папскай малітвай:

***Праслаўляем Цябе, Ойча, разам з усімі стварэннямі, якія выйшлі з Тваёй усемагутнай рукі. Яны Твае, поўныя Тваёй прысутнасці і Тваёй чуласці. Будзь праслаўлены, Пане!***

***Езу, Сыне Божы, усё праз Цябе было створана. Ты фармаваўся ва ўлонні Марыі, стаў часткай гэтай зямлі і глядзеў на гэты свет людскімі вачыма. Сёння Ты жывеш у кожным стварэнні ў сваёй хвале Уваскрослага. Будзь праслаўлены, Пане!***

***Духу Святы, які сваім святлом накіроўваеш свет да любові Айца і спадарожнічаеш стагнанням стварэння, Ты жывеш таксама ў нашых сэрцах, каб абуджаць нас да дабра. Будзь праслаўлены, Пане!***

***Пане Божа Адзіны ў Тройцы, прыгожая супольнасць бясконцай любові, навучы нас сузіраць Цябе ў прыгажосці Сусвету, дзе ўсё кажа нам пра Цябе. Абудзі нашае праслаўленне і ўдзячнасць за кожную істоту, якую Ты стварыў. Адары нас ласкаю пачуцця ўнутранай еднасці з усім, што існуе. Божа любові, пакажы нам нашае месца ў гэтым свеце, як прылады Тваёй любові для ўсіх істот гэтай зямлі, бо ніводная з іх не забытая Табою. Асвяці тых, хто мае ўладу і грошы, каб яны не трапілі ў грэх абыякавасці, каб любілі агульнае дабро, падтрымлівалі слабых і апекаваліся светам, у якім мы жывём. Убогія***

***і зямля клічуць: Пане, атулі нас сваёй моцаю і святлом, каб мы ахоўвалі кожнае жыццё, падрыхтавалі лепшую будучыню, каб настала Тваё Валадарства справядлівасці, спакою, любові і прыгажосці. Будзь праслаўлены, Пане! Амэн.***

*Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч*
*Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі*
*Старшыня Канферэнцыі*
*Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі*

*Мінск, 24 жніўня 2015 г.*

Источник: http://catholic.by/2/home/news/belarus/bishop-conference/126904-raspradzenne.html